*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЛЮТАГА 2007 г. СУБОТА

№ 28 (25893)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Прэзідэнту Беларусі прадстаўлены дапрацаваны праект антыкарупцыйнай праграмы на 2007—2010 гады

**Прэзідэнту Беларусі прадстаўлены дапрацаваны праект дзяржаўнай антыкарупцыйнай праграмы на 2007—2010 гады, дзе прадугледжаны комплекс прававых, кіраўніцкіх, эканамічных, адукацыйных і іншых мераў па процідзеянню карупцыі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, аб выніках дзейнасці органаў пракуратуры ў 2006 годзе Прэзідэнту далажыў учора генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч.**

Як было адзначана ў час даклада, органы пракуратуры ў мінулым годзе актыўна праводзілі работу па нагляду за выкананнем заканадаўства, каардынацыі дзейнасці праваахоўных органаў у барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй.

Паводле слоў генеральнага пракурора, выкананне Дзяржаўнай праграмы па ўзмацненню барацьбы з карупцыяй на 2002—2006 гады садзейнічала спыненню росту карупцыйнай злачыннасці, удасканаленню антыкарупцыйнага заканадаўства, вызначэнню асноўных напрамкаў і формаў прадухілення карупцыйных праяў. Прынятыя меры далі магчымасць скараціць у 2006 годзе колькасць карупцыйных злачынстваў на 18,6 працэнта.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў, каб дзейнасць органаў пракуратуры, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў па процідзеянню карупцыі і ў далейшым была сістэмнай, мэтанакіраванай, заснаванай на нормах новага антыкарупцыйнага заканадаўства.

Асаблівая ўвага ў мінулым годзе надавалася нагляду за выкананнем заканадаўства аб зваротах грамадзян. Разгледжана каля 45 тыс. зваротаў. У асноўным яны датычыліся парушэнняў працоўных, жыллёвых і іншых сацыяльных правоў. Кожны пяты прызнаны абгрунтаваным, і па ўсіх такіх зваротах прыняты канкрэтныя меры — адноўлены парушаныя правы грамадзян. Па выніках пракурорскіх праверак за прыняцце незаконных рашэнняў і фармалізм пры разглядзе зваротаў грамадзян 830 службовых асоб органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў і арганізацый прыцягнута да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

Прэзідэнт адзначыў, што пракуратура, ажыццяўляючы нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем заканадаўства, унесла значны ўклад у забеспячэнне сацыяльна-эканамічнай стабільнасці, умацаванне правапарадку і дысцыпліны, надзейнай абароны правоў і свабод грамадзян.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу забяспечыць дзейсны пракурорскі нагляд за выкананнем Дырэктывы № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату». Па фактах бюракратызму і валакіты ва ўсіх органах улады і кіравання павінны неадкладна прымацца жорсткія меры рэагавання.

Як падкрэсліў Пётр Міклашэвіч, пракурорскі нагляд за выкананнем заканадаўства ў сферы эканомікі быў прыярытэтным у тых галінах, якія непасрэдна ўплываюць на эканамічную, харчовую і энергетычную бяспеку дзяржавы. Па патрабаваннях пракурораў больш як 33 тыс. парушальнікаў законнасці прыцягнута да дысцыплінарнай, матэрыяльнай і адміністрацыйнай адказнасці, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў пазасудовым парадку кампенсаваны нанесены іх дзеяннямі матэрыяльны ўрон у суме больш як Br95 млрд. Агульныя і гаспадарчыя суды задаволілі 17,5 тыс. іскаў і спагналі з вінаватых матэрыяльны ўрон у памеры больш як Br160 млрд.

Прэзідэнт запатрабаваў ад генеральнага пракурора прыняцця вычарпальных мераў па пакрыццю ўчыненага дзяржаве ўрону, а таксама праяўлення большай актыўнасці пракурораў у навядзенні належнага парадку ў паліўна-энергетычнай сферы.

Як адзначыў генеральны пракурор, дзякуючы скаардынаваным дзеянням праваахоўных органаў адбыліся пазітыўныя працэсы ў дынаміцы і структуры злачыннасці. У 2006 годзе ў рэспубліцы зарэгістравана 191,4 тыс. злачынстваў, або на 2 працэнты менш, чым у 2005 годзе. Колькасць асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў скарацілася ва ўсіх рэгіёнах і ў цэлым па краіне на 11 працэнтаў.

Паводле яго слоў, перад органамі пракуратуры ў гэтым годзе стаіць задача больш эфектыўнай каардынацыі дзейнасці праваахоўных органаў па барацьбе са злачыннасцю, прыняцця дзейсных мераў па своечасоваму раскрыццю злачынстваў.

Генеральны пракурор таксама праінфармаваў Прэзідэнта аб ходзе папярэдняга следства і выніках судовага разгляду крымінальных спраў, што знаходзяцца на кантролі кіраўніка дзяржавы.

**Кар. БЕЛТА.**

## Сучасная бытавая тэхніка — з беларускіх канвеераў

Прэм'ер-міністр краіны Сяргей Сідорскі наведаў у Гомелі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гомельбудматэрыялы» і «Электраапаратура». Мэтай візіту на першае прадпрыемства было вызначыцца па будаўніцтву другой лініі па выпуску мінераватаўнага ўцяпляльніка. Справа ў тым, што ў верасні 2005 года тут была запушчана ў дзеянне лінія па вытворчасці ўцяпляльніка на аснове каменнай ваты, і гэта дазволіла закрыць патрэбы беларускіх прадпрыемстваў на 70 працэнтаў. Астатняя колькасць набываецца за валюту за мяжой.

Як вядома, рэспубліка нарошчвае будаўніцтва жылля, і нам гэты ўцяпляльнік патрэбен. Акрамя таго, маецца магчымасць прадаваць яго іншым краінам. Таму, каб цалкам задаволіць унутраныя патрэбы і павялічыць экспарт, і было прынята рашэнне пабудаваць у 2008 годзе, па сутнасці, новы завод. Сёлета пачнецца яго ўзвядзенне. Магутнасць — 500 тысяч квадратных метраў мінеральных пліт у год.

На «Электраапаратуры» прэм'ер-міністр азнаёміўся з ходам падрыхтоўкі вытворчасці па павелічэнню аб'ёмаў і пашырэнню асартыменту выпускаемай прадукцыі — газавых і электрычных пліт. Зараз тут іх выпускаецца 60 тысяч, і па сваёй цане яны ў два разы таннейшыя, чым на еўрапейскім рынку. Сяргей Сідорскі даў даручэнне міністэрствам эканомікі і энергетыкі, і прадпрыемствам «Атлант», «Электраапаратура» і брэсцкаму заводу «GEFEST» на працягу месяца прыняць узгодненыя рашэнні па развіццю гэтых прадпрыемстваў з тым, каб стварыць магутны холдынг па выпуску канкурэнтаздольнай бытавой тэхнікі.

На пасяджэнні ў аблвыканкаме было абмеркавана і пытанне аб далейшым развіцці Глушкевіцкага шчэбеневага завода.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Тэніс. Кубак Дэвіса

## ГУЛЯЕМ ЯК МОЖАМ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора ў сталічным футбольным манежы стартаваў матч Сусветнай групы 1/8 фіналу Кубка Дэвіса паміж камандамі Беларусі і Швецыі. Як і меркавалася, дэбютная сустрэча Уладзіміра Валчкова супраць шведа Робіна Содэрлінга насіла ў многім умоўны характар, бо майстэрства скандынава было значна вышэйшым за майстэрства беларуса —3:0 (3:6; 6:7; 1:6).

Гэта і пацвердзіў на пасляматчавай прэс-канферэнцыі Уладзімір Валчкоў. Ён сказаў: «Вельмі цяжка было разлічваць на цуд пры мінімуме гульнявой практыкі і рэйтынгавых паказчыкаў Содэрлінга. Швед гуляў, як хацеў, сказаў Валчкоў, а я — як мог.

Быў шанц зачапіцца за партыю, рэзюмаваў беларускі тэнісіст, аднак мне не ўдалося ў другім сэце рэалізаваць адзін з сэт-болаў, каб схіліць партыю ў свой бок.

Ігрок гасцей Робін Содэрлінг, атрымаўшы перамогу над Валчковым, тым не менш на сустрэчы з журналістамі ў адрас саперніка выказаўся вельмі дыпламатычна. Паводле яго слоў, беларускі тэнісіст засведчыў прадстаўнікам сур'ёзную сілу для любога саперніка. Пацвярджэнне таму — гульня ў адзіночным і парным разрадах у паўфіналах Уімблдонскага турніру 2000 і 2001 гадоў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Перад самым падпісаннем нумара ў друк закончыўся матч паміж Максімам Мірным і Томасам Ёхансанам. Максім, на жаль, таксама ўступіў — 0:3 (4:6; 4:6; 4:6).*

## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Махмуда Ахмадзінежада з 28-й гадавінай Ісламскай рэвалюцыі

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што стратэгічныя дамоўленасці, дасягнутыя ў ходзе яго візіту ў Іран у лістападзе мінулага года, будуць паспяхова ажыццёўлены на карысць двух народаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### УРАД БЕЛАРУСІ ПАВЫСІЎ АКЛАДЫ НІЗКААПЛАТНЫМ КАТЭГОРЫЯМ БЮДЖЭТНІКАЎ У СЯРЭДНІМ НА 10 ПРАЦЭНТАЎ

**Урад Беларусі прыняў рашэнне аб павышэнні заработнай платы асобных катэгорый работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 6 лютага гэтага года № 153, якое ўступае ў сілу з 1 студзеня 2007 года.**

Каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА гэты дакумент, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ларыса Полазава адзначыла, што пастановай урада павышаны памеры і дыяпазон прымянення карэкціруючых каэфіцыентаў да тарыфных ставак (акладаў) нізкааплатных катэгорый работнікаў бюджэтных арганізацый. Паводле яе слоў, раней карэкціруючыя каэфіцыенты прымяняліся адносна работнікаў, якія тарыфікуюцца 1—11 разрадамі, у памерах 2,05—1,01. Цяпер карэкціруючыя каэфіцыенты ўстаноўлены для работнікаў, якія тарыфікуюцца 1—13 разрадамі, у памерах 2,26—1,04. Гэта дасць магчымасць павысіць заработную плату ў сярэднім на 10 працэнтаў.

Акрамя таго, пастановай урада ўстаноўлена павышэнне да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў культурна-асветных устаноў у памеры 10 працэнтаў.

### СНЕГАПАДЫ ЗМЕНШАЦЦА

**У суботу, 10 лютага, пройдзе кароткачасовы снег, — паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. Захаваецца марознае надвор'е.**

У начныя гадзіны чакаецца 8-15 градусаў ніжэй за нуль, на паўночным захадзе марозы ўзмоцняцца да 20-23 градусаў. Днём тэмпература паветра складзе 6-12 градусаў ніжэй за нуль, а ў паўднёвых раёнах на працягу сутак — ад нуля да мінус 7 градусаў.

У нядзелю, 11 лютага, на фарміраванне надвор'я ў Беларусі ўзмоцніць свой уплыў скандынаўскі антыцыклон. Таму пройдзе невялікі снег, у паўднёвых раёнах рэспублікі стане на 2-3 градусы халадней. А ў паўночных раёнах марозы дасягнуць 23-27 градусаў. На астатняй частцы тэрыторыі Беларусі ў начныя гадзіны будзе 10-17 градусаў марозу. А днём тэмпература паветра складзе 8—15 градусаў марозу, на поўдні краіны — мінус 1—7 градусаў.

### ВЫШЫВАНАЯ КАШУЛЯ — АБЯРЭГ ДЛЯ ЎЛАДАЛЬНІКА

**Удзельніцы этнастудыі славянскай моды «Отрада» Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Ленінскага раёна Бабруйска атрымалі падарункі ад Аляксандра Лукашэнкі. Ліст, букеты ружаў і чэшскія чайныя сервізы — гэта падзяка кіраўніка дзяржавы за падарунак. Шэсць маладых жанчын на чале з кіраўніком студыі Аленай Зюлкоўскай зрабілі для Прэзідэнта льняную кашулю і упрыгожылі яе вышыванкай у стараданейшых традыцыях.**

Майстрыі працавалі над кашуляй два месяцы. Яны набылі на Аршанскім ільнокамбінаце нефарбаванае льнянае палатно і нашылі кашулю ўручную ў адпаведнасці са старажытнымі правіламі. Потым упрыгожылі яе вышыўкай: з зялёным, чырвоным і карычневым колерах выканалі «крыжыкам» арнамент-абярэг. Гузікі выразаў з елкі ўмелец з Жодзіна, а поас з воўны ўручную выткала майстрыха з Касцюковіча. Кашуля атрымалася выдатнай, але яе не ўдалося ўручыць Аляксандру Лукашэнку на «Дажынках» у Бабруйску. Таму ўдзельніцы этнастудыі перадалі свой твор праз знаёмых у Мінск і прыклалі да яго тлумачальны ліст. У ім жанчыны распавялі, што яны шылі і вышывалі кашулю з беларускімі песнямі і добрымі пачуццямі, а таму яна павінна надзейна абараняць свайго ўладальніка.

Як прызнаюцца ў цэнтры творчасці, дакладна яны і не верылі, што пасылка дойдзе да высокага адрасата. Тым не менш кіраўнік дзяржавы атрымаў і ацаніў падарунак. Бабруйскіх майстрых неўзабаве запрасілі ў гарвыканкам, дзе старшыня Магілёўскага аблвыканкама ўручыў ім ліст і падарункі ад Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы пажадаў жанчынам, каб іх жыццё было такім жа чыстым і цудоўным, як тое льнянае палатно, з якога яны шылі для яго кашулю.

**Алена КАЗЛОВА.**

### АБ'ЁМ ПРАДАДЗЕНЫХ НАСЕЛЬНІЦТВУ ЗАЛАТЫХ МЕРНЫХ ЗЛІТКАЎ У СТУДЗЕНІ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ НА 7,4 ПРАЦЭНТА

**Аб'ём прададзеных насельніцтву залатых мерных зліткаў у студзені 2007 года склаў больш як 84,1 кг (5110 штук), што на 7,4 працэнта больш, чым за студзень мінулага года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.**

Зліткі выраблены з золата найвышэйшай пробы (999) наміналам 1, 5, 10, 20, 50, 100, 250, 500, 1000 грамаў. Цяпер у наяўнасці ёсць зліткі ўсіх наміналаў. Найбольшай папулярнасцю сярод насельніцтва карыстаюцца 5-грамовыя залатыя зліткі, якіх за мінулы месяц было прададзена амаль трэць ад агульнай колькасці. У студзені было набыта 6 зліткаў па 1 кг і 1 — па 0,5 кг. Пры гэтым за мінулы месяц банкамі назад выкуплена больш як 5,9 кг золата. Паводле даных на 6 лютага 2007 года, цана продажу 1-грамовага залатога злітка склала Br60,89 тыс., злітка 1 кг — каля Br46,92 млн.

Як паведамлялася БЕЛТА, з 14 красавіка 2005 года Нацбанк пачаў рэалізацыю сярэбраных і плацінавых мерных зліткаў. За студзень 2007 года насельніцтвам набыта 55 плацінавых зліткаў агульным аб'ёмам 1,05 кг. Цана продажу 5-грамовага плацінавага злітка на 6 лютага бягучага года склала Br458,67 тыс., злітка 0,5 кг — Br42,27 млн. Аб'ём прададзеных за мінулы месяц сярэбраных зліткаў склаў 46,6 кг (862 штукі). Найбольш папулярныя сярод насельніцтва 10-грамовыя сярэбраныя зліткі, якіх за названы перыяд куплена 324 штукі.

Паводле даных на 6 лютага гэтага года, цана продажу 10-грамовага сярэбранага злітка склала Br21,41 тыс., злітка 1 кг — Br1,077 млн. Мерныя зліткі з каштоўных металаў даюць магчымасць насельніцтву больш эфектыўна распараджацца сродкамі і застрахоўваць іх ад магчымых рызык.

**Людміла САЦ, БЕЛТА.**

## Генадзь ЛЯПУНОЎ, першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

# «ТАРЫФЫ НЕ ПАВІННЫ АДЧУВАЛЬНА ЎДАРЫЦЬ ПА КІШЭНІ ЖЫХАРОЎ»

**Камунальнікі не маюць намеру кампенсаваць свае расходы за кошт адчувальнага павышэння тарыфаў для насельніцтва. Як заўважыў першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь Ляпуноў, адзін са шляхоў для гэтага — павелічэнне аб'ёмаў дадатковых платных паслуг. Яны запатрабаваныя ў жыхароў: такіх паслуг летась было аказана на 118 мільярдаў рублёў, а сёлета, як плануецца, гэты паказчык узрасце да 186 млрд рублёў.**

У галіне актыўна праводзіцца работа па змяншэнню затрат на аказанне комплексу жыллёва-камунальных паслуг. Паводле слоў Генадзя Ляпунова, за мінулы год выдаткі ўдалося знізіць на 4,7 працэнта. Такія тэмпы адпавядаюць заданням праграмы развіцця ЖКГ, у адпаведнасці з якой штогод затраты павінны «мінусаваць» на 4 працэнты, а да 2010 г. трэба выйсці на ўзровень 20 працэнтаў. Планавай мяжы магчыма дасягнуць перш за ўсё за кошт эфектыўнага ўкаранення энергазберагальных тэхналогій. Летась у камунальнай галіне ўдалося зэканоміць 213 тысяч тон умоўнага паліва і, такім чынам, зменшыць агульны расход «гаручага» на 8,5 працэнта.

Асаблівая ўвага надаецца выкарыстанню мясцовых відаў паліва. Як лічыць Генадзь Ляпуноў, сёлета іх спажыванне перавысіць 500 тысяч тон, што дазволіць давесці долю «мясцовых» у агульным паліўна-энергетычным балансе да 27 працэнтаў. Зараз расклад выглядае наступным чынам: 70 працэнтаў спажывання прыпадае на прыродны газ, 12 — на мазут, 18 працэнтаў — на мясцовыя віды паліва. Дарэчы, ужо налета доля выкарыстання апошніх дасягне ўзроўню 32 працэнтаў, для чаго спатрэбіцца пэўная мадэрнізацыя інжынернага абсталявання. Такая работа актыўна праводзіцца ўжо зараз — напрыклад, летась было устаноўлена больш чым 300 катлоў на мясцовых відах паліва. Таксама ў мінулым годзе ў камунальнай галіне адбыўся своеасаблівы прэцэдэнт — абнаўленне цеплasetак упершыню за апошнія гады дасягнула нарматыўнай мяжы (каб падтрымліваць іх у належным стане, неабходна замяняць не менш чым 4 працэнты ад агульнай працягласці).

Інтэнсіўна праводзіцца і капітальны рамонт жылля. Па гэтаму паказчыку ўжо тры гады таму ўдалося выйсці на ўзровень 1990 г. Тэмпы пастаянна павялічваюцца — летась пасля капітальнага рамонту ў эксплуатацыю было ўведзена 857 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Больш чым 244 тыс. кв. м склаў аб'ём цеплавой рэабілітацыі будынкаў. У асноўным усе работы праводзіліся за кошт адлічэнняў жыхароў (нагадаем, што ў «жыроўцы» ёсць спецыяльны радок, які па памеру налічэнняў адпавядае плаце за тэхнічнае абслугоўванне жылля). Такім чынам, летась жыхары «прафінансавалі» 54 працэнты неабходных сродкаў на капрамонт і цеплавую рэабілітацыю, 44 працэнты патрэбных грошай было выдзелена з мясцовых бюджэтаў, астатняе — з іншых крыніц. Летась удалося адрамантаваць 2,5 мільёна кв. метраў дахаў. Паводле слоў Генадзя Ляпунова, 85 працэнтаў жыллёвага фонду абсталявана дамафонамі — «зачынена» 82,6 з 97,3 тысячы пад'ездаў. На гэтыя патрэбы ў тым ліку прыцягнута больш чым 15 мільярдаў рублёў сродкаў жыхароў.

Па выніках мінулага года сумарны рост тарыфаў у сярэднім склаў 10,2 тысячы рублёў, што адпавядае 4,75 долара. Узровень вяртання жыхарамі затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг пры гэтым склаў 40,6 працэнта. Такі ж узровень, паводле слоў спецыяліста, плануецца вытрымаць і сёлета. З 1 студзеня павысіліся тарыфы на цяпло, гарачую ваду, газ і электрычнасць, і рост плацяжоў дасягнуў запланаваных 5 долараў. Такім чынам, па разліках упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, цяпер плата за ўвесь набор паслуг за стандартную аднапакаёвую кватэру (агульнай плошчай 32 квадратных метры, дзе жывуць 2 чалавекі) падчас ацяпляльнага сезона ў сярэднім «пацягне» на 81,4 тысячы рублёў, а ў летні час — на 49,7 тыс. рублёў. За двухпакаёўку (48 кв. метраў, 3 чалавекі) трэба адпаведна заплаціць 122,1 і 74,6 тыс. рублёў, а за трохпакаёўку (69 кв. м, 4 чалавекі) — 170 і 101,7 тыс. рублёў. Як адзначыў Генадзь Ляпуноў, тарыфы не павінны ўдарыць па кішэні жыхароў, мінімізаваць страты ад падаражання энерганосьбітаў перш за ўсё неабходна за кошт рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў. Паводле падлікаў, такім чынам у камунальнай галіне магчыма зэканоміць не менш чым 80 мільярдаў рублёў. Рост плацяжоў павінен адпавядаць узроўню заробкаў, паколькі разлікі за кватэру застаюцца адным з самых важкіх выдаткаў беларусаў. Паводле падлікаў, гэтыя расходы складаюць больш чым 7 працэнтаў сямейнага бюджэту.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БЕСПАРАДКІ Ў ІЕРУСАЛІМЕ

**У цэнтры Іерусаліма ўчора адбыліся сутыкненні паліцыі з арабскай моладдзю, у ходзе якіх былі паранены больш за 30 чалавек — 15 праваахоўнікаў і 18 дэманстрантаў.**

Арабы закідвалі паліцэйскіх камянямі, бутэлькамі з гаручай сумессю і іншымі цяжкімі прадметамі. Паліцыя адказвала шумавымі гранатамі, слёзатачывым газам і іншымі спецсродкамі. Сутыкненні адбыліся ў гістарычнай частцы горада ля Храмавай гары, дзе знаходзіцца мячэць Аль-Акса. Дэманстранты пратэставалі супраць будоўлі на гары пешаходнага моста і археалагічных раскопак побач з храмам, якія могуць пашкодзіць мячэць.

### АТАКА З КОСМАСУ

**У Індыі метэарыт забіў двух чалавек і параніў пецярых.**

Інцыдэнт адбыўся ў вёсцы Банчола штата Раджастан. На групу качэўнікаў, якія сядзелі ў полі, з неба зваліўся невядомы лятальны аб'ект. Адбыўся выбух, на месцы якога стварыўся невялікі кратэр. Два чалавекі загінулі, пяцёра паранены. Аб'ект аказаўся невялікім метэарытам.

### 2000 АФІЦЭРАЎ-ЗЛАЧЫНЦАЎ

**У расійскай арміі служаць больш за дзве тысячы афіцэраў, якія здзейснілі наўмысныя злачынствы ў час праходжання ваеннай службы, заявіў галоўны ваенны пракурор РФ Сяргей Фрыдзінскі.**

Ён таксама адзначыў, што толькі летась некалькі дзесяткаў афіцэраў, якія мелі судзімасці, здзейснілі паўторныя злачынствы. Дарэчы, афіцэраў-злачынцаў у Расіі з арміі не звальняюць, і толькі зараз у Савет Федэрацыі выносіцца прапанова аб такім рашэнні.

### СТАРАЖЫТНЫЯ РАМЭО І ДЖУЛЬЕТА?

**Днямі ў раёне італьянскага горада Мантуя, мястэчку Вальдара, археолагі раскапалі шкілеты мужчыны і жанчыны, якія праляжалі абняўшыся прыкладна 5—6 тысяч гадоў.**

Знаходка адносіцца да перыяду неаліту. Папярэдні агляд пары, якая атрымала назву



«Вальдарскія палюбоўнікі», паказаў, што ў мужчыны ў пазваночніку захраснула страла, а жанчыне страла трапіла ў бок. Згодна з адной з версій, мужчына быў забіты, а жанчына была яму ахвяраваная і пахаваная побач.

### У ТУРМУ ЗА... ПРАГУЛЫ Ў ШКОЛЕ

**Школьніцу з горада Герліц (федэральная зямля Саксонія, Германія) прыгаварылі да двух тыдняў турэмнага зняволення за сістэматычныя прагулы.**

У мясцовым Міністэрстве адукацыі патлумачылі такое суровае рашэнне суда тым, што бацькі 15-гадовай дзяўчынкі адмовіліся плаціць штраф, а сама прагульшчыца ўхілілася ад грамадскіх работ. Як паведамляецца, вучаніца прапусціла «значную» колькасць урокаў.

### $500 ТЫСЯЧ ЗА СМЕРЦЬ

**У ЗША раптоўна памерла 39-гадовая зорка часопіса Playboy, фотамадэль і кінаактрыса Анна Ніколь Сміт.**

Анна (сапраўднае імя Вікі Лін Хоган) стала сусветна вядомай у 90-я гады мінулага стагоддзя пасля таго, як яе фотаздымкі з'явіліся ў вядомым эратычным часопісе Playboy. У 1994 годзе 26-гадовая мадэль выйшла замуж за 89-гадовага мільярдэра Говарда Маршала, які праз 14 месяцаў памёр. Пасля таго яна доўгі час судзілася з яго сынам Пірсам за спадчыну, і толькі ў маі мінулага года суд прызнаў за ёй гэтае права.



Па самай распаўсюджанай версіі прычынай яе смерці сталі наркотыкі, пасля прыёму якіх у яе спынілася сэрца. Як стала вядома, кадры апошніх хвілін жыцця Анны Ніколь Сміт былі прададзеныя за 500 тысяч долараў.

## Урад Беларусі зацвердзіў дыферэнцыяваныя тарыфы на электраэнергію ў розны час сутак

Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў ад 30 студзеня 2007 года № 116. 1 кВт.г электрычнай энергіі ў абсталяваных электрычнымі плітамі жылых дамах (кватэрах) у зоне мінімальных і максімальных нагрузак каштуе Br54,1 і Br162,3 адпаведна, 1 кВт.г электраэнергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш як 5 кВт — Br112,1 і Br336,3, а таксама 1 кВт.г электраэнергіі, за выключэннем пералічаных відаў каштуе пры мінімальных нагрузках Br74,7, максімальных — Br224,1. У выхадныя і святочныя дні тарыф на электрычную энергію прымяняецца ў зоне мінімальных нагрузак. Устаноўлены таксама часавыя перыяды зоны мінімальных нагрузак: студзень — сакавік, кастрычнік — снежань з 11.00 да 17.00 і з 20.00 да 8.00, красавік — верасень з 11.00 да 19.00 і з 22.00 да 8.00. Часавымі перыядамі зоны максімальных нагрузак з'яўляюцца студзень — сакавік, кастрычнік — снежань з 8.00 да 11.00 і з 17.00 да 20.00, красавік — верасень з 8.00 да 11.00 і з 19.00 да 22.00, патлумачылі ў апараце Саўміна.

**ЗАО «СНЕЧКУС» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже зданий и сооружений торгового центра «Степянка», расположенных в г. Минске по ул. Карвата, 4.**

Лот № 1 — здание торгового центра «Степянка» (общая площадь — 1119,2 кв. м), сооружение торговых павильонов (общая площадь — 173,4 кв. м), здание бытового назначения (общая площадь — 39,3 кв. м).

Начальная цена — 7 260 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Задаток в размере 100 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Площадь земельного участка — 0,3857 га. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 28 февраля 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 27 февраля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. (Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.01.2007).

**Телефоны для справок: 227-48-36, 290-51-90.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**по продаже квартиры № 1 двухквартирного двухэтажного блокированного жилого дома с цокольным этажом и террасой по ул. Парниковой, 49 в г. Минске**

Лот № 1 — квартира № 1 двухквартирного двухэтажного блокированного жилого дома с цокольным этажом и террасой по ул. Парниковой, 49 в г. Минске. Общая площадь 277 кв.м, жилая площадь 107,6 кв.м. Земельный участок (кадастровый номер 500000000001000987) площадью 0,0985 га для обслуживания жилого дома передан в общую долевую собственность (актуальные права — 1/2 доли в праве собственности). Начальная цена — 1 330 000 000 белорусских рублей.

Организатор аукциона — УП «Минский городской центр недвижимости». Продавец — Рейзина Анна Давыдовна. Задаток в размере 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата за приобретенный объект осуществляется в порядке, установленном договором купли-продажи. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 13 марта 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 12 марта 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227-48-36.**

Доктар адкажа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На наступным тыдні асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:**

**12 лютага** — галоўны ўрач 16-й сталічнай паліклінікі Наталля Леанідаўна АСАДЧАЯ.

**13 лютага** — галоўны ўрач 29-й сталічнай паліклінікі Раіса Рыгораўна ЗВАНЕЦ.

**14 лютага** — галоўны ўрач 1-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Людміла Уладзіміраўна ГНЯДЗЬКО.

**15 лютага** — галоўны ўрач 10-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Людміла Аляксандраўна БАМБЕРАВА.

**16 лютага** — галоўны ўрач 4-й клінічнай бальніцы г. Мінска Аляксандр Анатольевіч ТРАЯНАЎ.

*У графіку магчымыя змяненні.*

ISSN 1990-763X

9771990763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.02.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 142,00 |
| 1 еўра | 2 786,96 |
| 1 латвійскі лат | 4002,62 |
| 1 літоўскі літ | 807,33 |
| 1 чэшская крона | 98,67 |
| 1 польскі злоты | 717,64 |
| 1 расійскі рубель | 81,30 |
| 1 украінская грыўня | 425,00 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,3473 |
| 10 UAH | 52,0307 |
| 1000 BYR | 12,2481 |
| EUR | 34,3015 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.02.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2220 / 2320 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвацеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

Ва ўрадзе

# По слядах дырэктывы № 2

**Савет Міністраў у выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы прыняў шэраг мераў па дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і прыцягненню да адказнасці службовых асобаў за парушэнне дзеючага заканадаўства аб зваротах грамадзян.**

Кіраўнікі арганізацый, у якіх выяўлены парушэнні парадку работы са зваротамі грамадзян па прынцыпу «адно акно», прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Акрамя таго, па даручэнню ўрада дадаткова прыцягнуты да адказнасці кіраўніцкія кадры цэнтральных апаратаў міністэрстваў і аблвыканкамаў, якія не арганізавалі выкананне і кантроль за выкананнем устаноўленага парадку работы на падставе заяўнага прынцыпу.

Так, меры дысцыплінарнага спагнання выкарыстаны ў адносінах да першага намесніка начальніка ўпраўлення юстыцыі Брэсцкага аблвыканкама П. Баброўскага, намесніка начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама Н. Мярэчка, выконваючага абавязкі першага намесніка і намесніка старшыні камітэта па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама С. Спірыдонава і С. Галубковай, начальніка аддзела кадравай работы і справаводства ўпраўлення адукацыі названага аблвыканкама М. Савельевай, старшыні Жлобінскага райвыканкама М. Касюкова, намесніка начальніка ўпраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама М. Прыступіна, намесніка начальніка ўпраўлення адукацыі гэтага ж аблвыканкама В. Петрусенка. Старшыні Баранавіцкага гарвыканкама В. Дзічкоўскаму і начальніку ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама В. Мілашэўскаму ўказана на недахопы ў арганізацыі работы са зваротамі грамадзян.

Аналіз прынятых дадатковых мераў па прыцягненню да адказнасці службовых асобаў на месцах за недахопы ў рабоце са зваротамі грамадзян, выяўленыя камісіяй Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паказаў, што таксама накладзены спагнанні:

па Віцебскай вобласці: кіраўніку спраў Талачынскага райвыканкама В. Рашэтнікаву аб'яўлена заўвага, кіраўніку спраў Пастаўскага райвыканкама А. Мышко аб'яўлена заўвага, старшыні Варапаеўскага пасялковага выканаўчага камітэта А. Аліхверу аб'яўлена вымова, начальніку аддзела па будаўніцтву, архітэктуры і жыллёва-камунальнай гаспадарцы Талачынскага райвыканкама Л. Лемешавай аб'яўлена заўвага. Акрамя таго, 13 службовых асобаў Віцебскага, Аршанскага, Полацкага гарвыканкамаў, Дубровенскага, Міёрскага, Аршанскага райвыканкамаў за валакіту ў разглядзе зваротаў грамадзян прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці;

па Гомельскай вобласці: кіраўніку спраў В. Басюку і загадчыку аддзела адукацыі Петрыкаўскага райвыканкама В. Лазарчуку аб'яўлены вымовы. Лазарчуку таксама паніжаны клас дзяржслужачага тэрмінам на 3 месяцы;

па Гродзенскай вобласці: на начальніка ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне Зяльвенскага райвыканкама накладзены штраф у памеры 4 базавых велічынь, начальніку ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне Лідскага гарвыканкама аб'яўлена заўвага, дырэктару сярэдняй школы № 5 Смаргоні В. Храмянкову аб'яўлена заўвага;

па Мінскай вобласці: сакратару Старобінскага пасялковага выканкама Салігорскага раёна Т. Адамовіч аб'яўлена вымова, сакратару Долгаўскага сельвыканкама таго ж раёна В. Тамілаву аб'яўлена заўвага;

па Магілёўскай вобласці: старшыні Восаўскага сельвыканкама Бабруйскага раёна В. Гардзіевічу і старшыні Варатынскага сельвыканкама таго ж раёна аб'яўлены вымовы;

па гораду Мінску: намесніку кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна А. Красуцкаму аб'яўлена вымова, намесніку кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Д. Навіцкаму аб'яўлена вымова, першаму намесніку кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна А. Шклярыку аб'яўлена заўвага, першаму намесніку кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Н. Скіпору аб'яўлена заўвага.

Вывучэнне спраў на месцах паказала, што ў большасці выканаўчых і распарадчых органаў у апошні час значна павышана адказнасць кадраў і патрабавальнасць да службовых асобаў за работу з насельніцтвам.

**Ул. інф.**

## АНТЫКРЫЗІСНЫЯ КІРАЎНІКІ ЗМОГУЦЬ ВЕСЦІ НЕКАЛЬКІ СПРАЎ?

У Беларусі вельмі не хапае антыкрызісных кіраўнікоў для вядзення спраў аб банкруцтве суб'ектаў гаспадарання. Аб гэтым было заяўлена 8 лютага на прэс-канферэнцыі ў Вышэйшым гаспадарчым судзе (ВГС).

Як паведаміла журналістам намеснік старшыні ВГС Лілія Козырава, зараз у вядзенні гаспадарчых судоў Беларусі знаходзяцца 452 справы аб банкруцтве, тады як кіраўнікоў напалову менш. 28 спраў прыпынены, таму што няма антыкрызісных кіраўнікоў...

**БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Радзільны дом Мінскай вобласці параўнальна малады. У 1979 годзе ў эксплуатацыю ўведзена першая чарга аб'екта — гінекалагічны і адміністрацыйны карпусы, у 1980 годзе прыняты першыя роды. За гэтыя гады тут сфарміраваўся згуртаваны, высокапрафесійны калектыў са сваімі традыцыямі, які па праву ганарыцца званнем «Бальніца, добразычлівая да дзіцяці», што прысвоена радзільнаму дому Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя СААЗ. За 2006 год у Мінскім абласным радзільным доме зафіксавана нараджэнне 4166 дзяцей. Сярод нованароджаных было 70 двайняў і 1 тройня. У маштабах гэтай медыцынскай установы нараджальнасць у мінулым годзе ў параўнанні з 2000-м павялічылася амаль на 39 працэнтаў.

НА ЗДЫМКУ: старшая сястра аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных Галіна ТРАЦЦЯКОВА.

## ПРЭМІІ — НАСТАЎНІЦАМ І ВУЧНЯМ

**За тое, што яны затрымалі злодзея.**

Як нам паведамілі ў прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, у час правядзення дыскатэкі да настаўніц Новамаркавіцкай школы Валянціны Говар і Алены Сарокінай падышоў адзінаццацікласнік Аляксандр Міраеўскі і сказаў, што чуў у магазіне, калі ішоў на дыскатэку, нейкі трэск. Магчыма, зладзеі. Усе трое яны адправіліся туды і ўпэўніліся, што нехта там арудуе, аб чым па мабільніку паведамілі ў міліцыю, за 20 кіламетраў ад вёскі. Ці паспеюць адтуль? Таму вырашылі «браць» зладзеяў самі, вядома ж, з пэўнай доляй рызыкі. Усё скончылася так: злодзеем аказаўся 14-гадовы школьнік...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ПІНСКІ «ЎНІВЕРСАЛ»

**Нават бывалыя аператыўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі прызнавалі, што затрымалі чалавека надзвычай таленавітага.**

Зрабіць пячаткі, штампы, беларускія, расійскія, казахскія пашпарты, замежную валюту — трэба ўмець. Ды гэта яшчэ што! Дома ў жыхара Пінска знайшлі самаробны пісталет-кулямёт, абрэз гладкаствольнага ружжа, іншую зброю і боепрыпасы. Каб такія здольнасці ды накіраваць у правільнае рэчышча, мог бы стаць знакамітасцю. А так затрыманы супрацоўнікамі абласнога ўпраўлення КДБ за незаконны выраб і захаванне зброі, а таксама незаконныя аперацыі з дакументамі і валютай пінчанін будзе адказваць перад судом.

**Яна СВЕТАВА.**

## Сярод памілаваных Прэзідэнтам — большасць жанчын

**Летась указамі кіраўніка дзяржавы памілавана 168 асуджаных. Сярод іх 128 — жанчыны, большасць з якіх мае непаўналетніх дзяцей. Гэта істотная дынаміка ў выкарыстанні інстытута памілавання. Для параўнання: за 2002—2005 гады было памілавана 15 асуджаных.**

Накіраванасць прынятых дзяржаўных рашэнняў аб памілаванні ў большасці менавіта жанчын тлумачыцца як асобым значэннем для Беларусі 2006 года як Года маці, так і тым, што ў цэлым з боку Прэзідэнта праяўляецца асаблівая ўвага ўмацаванню асноў мацярынства і дзяцінства ў краіне.

Выкарыстанне памілавання заўсёды асноўваецца на строга індывідуальнай ацэнцы ўсёй інфармацыі, якая характарызуе асобу і яе праціпраўныя дзеянні. На падставе гэтага выпрацоўваецца калектыўнае меркаванне дзеючай пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Камісіі па пытаннях памілавання і кіраўніком дзяржавы прымаюцца рашэнні аб памілаванні. Разам з тым памілаванне — гэта не ўсёдараванне. І няма сэнсу выкарыстоўваць гэты інстытут, калі небяспека здзяйснення новых злачынстваў асобай застаецца.

Дзяржаўныя меры па памілаванню асуджаных, якія актыўна рэалізуюцца ў нашай краіне, сведчаць пра тое, што дзяржава на справе ажыццяўляе прынцып гуманізму ў галіне крымінальна-прававой палітыкі. Людзі, якія аступіліся, але раскаяліся ў здзейсненых злачынствах і імкнуцца стаць паўнапраўнымі членамі грамадства, маюць права разлічваць на давер і падтрымку дзяржавы.

**Сяргей ПРОТАС.**

З залы суда

# СЛЕПАТА

**Кароткая інфармацыя пра гэты трагічны выпадак прайшла ў прэсе, і толькі адна газета «па гарачых слядах» напісала больш падрабязна. Праўда, пацярпелая Юля Станюк лічыць, што не ўсё было так. Але тады зрабіў уплыў эмацыянальны фактар, ды і да суда яшчэ было далёка. А сёння, калі ўсё супакоілася, а суд Баранавіцкага раёна падвёў пад той падзеяй рысу, то можна пра ўсё пагаварыць грунтоўна.**

Каля 14 гадзін 1 кастрычніка 2006 года жыхар вёскі Малая Сваротва Мікалай Зенька паставіў у лесе самастрэл на дзіка. Побач было кукурузнае поле, і звяры выходзілі на яго падсілкавацца. Самастрэл дзейнічаў па прынцыпу мышалоўкі. Калі дзік натыкаўся на расцяжку, якая на вышыні 35-40 см перагароджвала сцежку, адбываўся стрэл.

Паставіўшы сваё небяспечнае прыстасаванне, М. Зенька падаўся дадому і на паўдарозе сустрэў Юлю Станюк і Дзяніса Адамчука — яны ішлі ў грыбы. Перакінуўшыся словам з хлопцам, 69-гадовы пенсіянер пайшоў сваёй дарогай. Ён мог папярэдзіць маладых, але яму падалося, што тыя пакрочылі ў другі бок, і таму прамаўчаў. Магчыма, гэта і так, але які браканьер будзе расказваць пра свае сакрэты?

У лесе Юля і Дзяніс разышліся ў розныя бакі, і дзяўчына выпадкова зачапіла тую злашчасную расцяжку. Стрэлам з самастрэла Юлі было нанесена цяжкае раненне: перабіта косць бядра, рваныя раны правага і левага бядра... Прыбег Дзяніс, а следам яго бацька, які непадалёк пасвіў кароў. Хлопец падаўся ў вёску па дапамогу, а старэйшы Адамчук перавязаў параненую. У бальніцы ёй зрабілі аперацыю. Можна сказаць, што Юлі пашанцавала, бо калі б зарад трапіў у жывот, наступствы маглі быць непрадказальнымі.

У гэтай справе найбольшую ўвагу прыцягвае наступны факт. М. Зенька заявіў, што самастрэлы ён ставіў з 1991 года і тады вырабляў усе неабходныя боепрыпасы. Чалавек 15 гадоў браканьерствуе і самым варварскім спосабам (які даволі часта калечыць звера), а пра гэта ніхто ў вёсцы не ведае?

Безумоўна, гэта не так. Два гады таму леснікі забралі гэты самастрэл з лесу — знайшлі выпадкова. А. Клышка прывёз яго дадому, і там прыстасаванне для палявання спрацавала — стрэліла. Самастрэл быў разабраны на часткі, але неўзабаве знік з двара і зноў апынуўся ў М. Зенькі. Чаму ўжо тады не паступіла ў міліцыю заява, што знойдзена агнястрэльнае прыстасаванне? Ды і спробу незаконнага палявання неабходна было б дакументальна зафіксаваць.

А той факт, што Зеньку міліцыя вылічыла адразу ж, гаворыць сам за сябе. Чым займаецца мясцовы пенсіянер, калі не для ўсіх, то для многіх жыхароў вёскі не было сакрэтам. Але маўчалі, хоць на месцы Юлі мог апынуцца кожны.

Імкненне на ўсё, што не датычыцца цябе, заплюшчваць вочы — гэта не грамадзянская пазіцыя, а местачковая слепата. Хоць тут нельга не ўлічваць і фактар стаўлення да браканьерства ў цэлым. Яно ў нас яшчэ не лічыцца злачынствам у прамым значэнні гэтага слова.

Зенька заявіў, што за 15 гадоў ён ніводнага дзіка не ўпаляваў, хоць самастрэлы ставіў рэгулярна. Як яно там было на самай справе, невядома, але няўжо сам М. Зенька не падумаў, што на лясную сцяжынку замест дзіка можа выйсці чалавек?

Пенсіянер растлумачыў, што подступы да самастрэла ён «агароджваў» ніткай, якая была нацягнута прыкладна ў метры ад зямлі. Калі чалавек кранаў яе, то самастрэл ужо стрэліць не мог. Асабіста я ў такую складаную сістэму папярэджвання не веру, ва ўсякім разе, на гэты раз яна не спрацавала. Хоць ці была тая нітка ўвогуле?

Пры вобыску ў Зенькі знайшлі паляўнічыя патроны, два піраўдарнікі, два нажы, якія належалі да халоднай зброі, нейкае шэрае сыпучае рэчыва ў бляшанцы... Але пад крымінальны артыкул за выраб гладкаствольнай зброі (самастрэла), як і боепрыпасаў пенсіянер не падпаў, бо тады, калі ўсё гэта выраблялася, у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам БССР 1960 года за такія дзеянні крымінальнай адказнасці не было. Цікава, а ці ёсць у нас адказнасць за захаванне боепрыпасаў ці іх кампанентаў?

А падпаў М. Зенька толькі пад артыкул за нанясенне цяжкага цялеснага пашкоджання па неасцярожнасці.

Калі пісаліся гэтыя радкі, у Юлі Станюк знялі швы. Яна атрымала інваліднасць другой групы і яшчэ ходзіць з мыліцамі — лячэнне працягваецца пяты месяц і невядома, калі закончыцца. Праўда, дзяўчына спадзяецца, што ўсё будзе добра, і на М. Зеньку не трымае крыўды. Нават на судзе яна не хацела, каб пенсіянера моцна каралі. Галоўнае, што Дзяніс не пакінуў яе ў цяжкую хвіліну.

На судзе Зенька поўнасцю прызнаў сваю віну і гэта, як і іншыя акалічнасці, былі прызнаныя судом змякчаючымі.

Пацярпелай М. Зенька павінен выплаціць 5 млн рублёў і больш за мільён — бальніцы за лячэнне.

А пакаранне састарэлы браканьер атрымаў у выглядзе «...абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады».

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## БАНКІРЫ БЕЛАРУСІ І ІРАНА АБМЕРКАВАЛІ СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ

**Аб пашырэнні двухбаковага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Ісламскай Рэспублікай Іран ішла размова падчас афіцыйнага візіту ў Тэгеран беларускай дэлегацыі банкаўскіх колаў на чале са старшынёй праўлення Нацбанка Пятром Пракаповічам.**

Як паведаміў прэс-сакратар Нацбанка Міхаіл Журавовіч, на сустрэчах, якія прайшлі з кіраўніком Цэнтрабанка Ірана доктарам Ібрахімам Шэйбані, кіраўнікамі Мінэканомікі і фінансаў, МЗС, шэрагу буйнейшых банкаў закраналіся ў тым ліку і пытанні пашырэння гандлёва-эканамічных сувязяў дзвюх краін, нарошчвання таваразабароту. Іранскі бок выказаў намер у бліжэйшы час прапрацаваць і прыступіць да рэалізацыі пытання аб адкрыцці ў Беларусі прадстаўніцтва аднаго са сваіх банкаў, а таксама стварыць на тэрыторыі рэспублікі сумесныя або даччыныя крэдытна-фінансавыя ўстановы. Абазначана гатоўнасць адкрыць крэдытныя лініі пад сумесныя праекты праз Банк развіцця экспарту Ірана і адпаведны Фонд, аказваць фінансавае садзейнічанне сваім кампаніям у набыцці беларускай прадукцыі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Канферэнц-зала

## Выпадковыя няўдзячныя госці

**Палову кватэрных крадзяжоў у сталіцы здзяйсняюць асобы, якіх прыводзяць дадому самі ж гаспадары**

Жыць у беларускай сталіцы стала яшчэ спакайней. Менавіта такім быў лейтматыў выступлення начальніка Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў (ГУУС) Мінгарвыканкама Анатоля Куляшова падчас прэс-канферэнцыі, на якой ён паведаміў аб выніках працы сталічнай міліцыі за 2006 год.

Генерал адзначыў, што ў мінулым годзе супрацоўнікі ГУУС разгледзелі больш за 93 тысячы заяў і паведамленняў аб злачынствах і здарэннях, па якіх узбуджана больш за 40 тысяч крымінальных спраў. Амаль 80 працэнтаў гэтых спраў не ўяўлялі вялікай грамадскай небяспекі. Колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў зменшылася на 10 працэнтаў, «бытавых» — на чвэрць. Паводле слоў Анатоля Куляшова, летась былі дасягнуты значныя поспехі ў раскрыцці асабліва цяжкіх злачынстваў. Напрыклад, з 90 забойстваў засталіся нераскрытымі толькі два, устаноўлены ўсе асобы, вінаватыя ў згвалтаваннях, выяўлены больш за дзве трэці рабаўнікоў, знойдзены больш за тысячу зніклых грамадзян.

А самымі распаўсюджанымі злачынствамі ў Мінску застаюцца крадзяжы маёмасці. Зарэгістравана 23 тысячы такіх парушэнняў закона. Шмат клопату вартавым правапарадку дастаўляюць «паляўнічыя» за чужымі «мабільнікамі». Летась у нашай сталіцы было зафіксавана каля 9 тысяч падобных крадзяжоў. Паводле слоў Анатоля Куляшова, сышчыкам ўдаецца раскрыць за тыдзень па 3—4 такія злачынствы. Так што шанцы вярнуць сваю маёмасць у ахвяраў «мабільных зладзеяў» ёсць. Аднак кіраўнік ГУУС усё ж параіў грамадзянам самім праяўляць пільнасць і больш уважліва сачыць за сваімі тэлефонамі. «Наіўныя» мінчане — сапраўдная знаходка і для кватэрных зладзеяў. У мінулым годзе прыкладна палову ахвяраў такіх злачынстваў самі ж прыводзілі дадому зладзеяў, разам выпівалі, а назаўтра прачыналіся ў «спустошаных» кватэрах. Некаторыя зладзеі залазілі ў чужое жыллё даволі арыгінальным спосабам. Напрыклад, была затрымана група «дамушнікаў», якія траплялі ў кватэры праз вентыляцыйныя шахты. На рахунку гэтых «спелеолагаў» каля 66 крадзяжоў. Кіраўніцтва ГУУС нават накіроўвала мэру сталіцы спецыяльны ліст, у якім прапаноўвала тэрмінова прыняць меры для перакрыцця такіх шляхоў у кватэры мінчан.

Адной з самых вострых праблем у сталіцы застаецца п'янства. Толькі летась на ўліку адмысловыя медустановы былі пастаўлены 6 тысяч жыхароў сталіцы, якія злоўжываюць алкаголем. Зараз у гэтым сумным спісе 37 тысяч мінчан, з якіх 6,5 тысячы — жанчыны. У мінулым годзе ў Мінску былі ўведзены абмежаванні на гандаль спіртовымі напоямі ў начны час. Колькасць кругласутачных крамаў скарацілася з 22 да 14. Але і ў тых гандлёвых кропках, якія засталіся, забаронена прадаваць ноччу піва, пладова-ягаднае віно і гарэлку. Праўда, гэтую «нішу» спрабуюць заняць самагоншчыкі і гандляры сурагатам. Сталічныя міліцыянеры летась канфіскавалі больш за 18 тон спіртовай вадкасці, знішчылі 14 самагонных апаратаў. Аднак, па ўсім відаць, святкаваць перамогу над мінскімі «бутлегерамі» яшчэ рана. Толькі за мінулы тыдзень з незаконнага абароту было канфіскавана больш за 200 літраў алкагольных напояў і больш за 1,5 тоны рознага сурагату.

Як адзначыў Анатоль Куляшоў, актыўную дапамогу ў выяўленні падпольных гандляроў і вытворцаў спіртовых напояў аказваюць самі жыхары сталіцы. Увогуле, мінчане сталі больш давяраць вартавым правапарадку. Па выніках сацыялагічных даследаванняў рэйтынг даверу міліцыі ў сталіцы складае 45 працэнтаў, а кожны дзесяты мінчанін выказаў гатоўнасць прыняць актыўны ўдзел у ахове грамадскага парадку ў якасці дружынніка.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# Напалеон Орда і яго вобраз Беларусі

## 11 лютага спаўняецца 200 гадоў з дня нараджэння Напалеона ОРДЫ — таленавітага піяніста, кампазітара, мастака, асветніка

*Пра жыццё і творчасць нашага слыннага земляка мы гутарым з Аляксандрам ЛАКОТКАМ — дырэктарам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, членам-карэспандэнтам НАНБ, доктарам архітэктуры, доктарам гістарычных навук, прафесарам.*

**— Напалеон Орда — досыць незвычайнае для нашых мясцін імя і прозвішча...**

— Ён нарадзіўся ў 1807 годзе ў фальварку Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерні (зараз Іванаўскі раён). Нарадзіўся на пераломе эпох. Яшчэ нядаўна былі падзеі, звязаныя з Вялікай Французскай рэвалюцыяй, яшчэ ў Еўропе толькі пачаліся тыя пераўтварэнні, якія ўскалыхнулі ўвесь кантынент, — пад высакароднымі дэвізамі рэвалюцыі пра свабоду, роўнасць, братэрства... Еўрапейскія народы яшчэ з надзеяй глядзелі на пачынаючага імператара Напалеона — са спадзяваннем, што гэтыя пошукі знойдуць працяг. Таму на пачатку XIX ст. у еўрапейскіх дваранскіх сем'ях было вельмі модна даваць хлопчыкам імя Напалеон. Нездарма ж Пушкін пісаў: «Мы все глядим в наполеоны...». Хутка многія расчараваліся ў імператары, усё пайшло інакш. Еўропа апынулася ў лоне крывавых войнаў, але гэта было потым...

Род Ордаў — татарскага паходжання. Далёкі продак Напалеона напрыканцы XIV стагоддзя прыбыў з зямель Залатой Арды ў часы вялікага князя літоўскага Вітаўта. Орды аддана служылі сваёй новай Айчыне.

Нарадзіўся Напалеон Орда ў адукаванай сям'і маршалка шляхты Кобрынскага павета, інжынера-фартыфікатара Міхаіла Орды. А маці была з роду Бутрымовічаў — вядомага на Піншчыне дваранскага роду. Яна была выдатнай піяністкай. Хлопчык атрымаў цудоўную пачатковую адукацыю ў родных Варацэвічах. Потым паспяхова скончыў Свіслацкую гімназію, якая ў тагачаснай Расійскай Імперыі была досыць вядомай, славілася добрай рэпутацыяй. У 1823 годзе паступіў у Віленскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт. А там, як і па ўсёй Еўропе, распаўсюджваліся вальнадумныя дэмакратычныя ідэі. Напалеон Орда, Тамаш Зан, Уладзіслаў Сыракомля, многія іншыя таленавітыя юнакі ўніверсітэта ўдзельнічалі ў розных тайных групоўках... Скончылася гэта арыштам, 15 месяцаў Орда адсядзеў у турме. Потым вярнуўся ў родны фальварак Варацэвічы, але заставаўся пад наглядам паліцыі.

**— Удзел у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі 1830—1831 гг. кардынальна змяніў яго лёс?**

— Сапраўды, Орда прымаў актыўны ўдзел у паўстанні ў складзе палка коннай гвардыі Літоўскага корпуса, атрымаў шэраг узнагарод... Пасля паражэння паўстання вымушаны быў эміграваць за мяжу. Ён выдаваў сябе за слугу свайго сябра Палонскага. Амаль што пешшу прайшоў Польшчу, Аўстрыю, Італію... Апынуўся ў Парыжы ў 1833-м.

Напалеон Орда пазнаёміўся з Шапэнам, Лістам, Берліёзам, Клодам Дэбюсі, Адамам Міцкевічам, Бальзакам, Тургеневым, Палінай Віярдо... З многімі ён сябраваў. Гэта спрыяла развіццю яго прыродных дараванняў. Ён браў урокі музыкі ў Фрэдэрыка Шапэна. Ды і сам пісаў даволі ўдалыя паланэзы, вальсы, мазуркі, рамансы — яны былі ўхваленыя Ф. Шапэнам, Ф. Лістам, С. Манюшкам. У 1838 годзе Н. Орда выдаў «Альбом твораў польскіх кампазітараў». Ён напісаў і шэраг вучэбных твораў па музыцы, па музычнай граматыцы.

Яго музычныя заслугі былі прызнаныя ў Еўропе — у сярэдзіне 1940-х яго прызначылі на пасаду дырэктара Італьянскай оперы ў Парыжы.

**— А якім чынам Напалеон Орда захапіўся малюнкам?**

— Шапэн першым заўважыў яго мастацкія здольнасці і параіў звярнуцца ў студыю вядомага майстра архітэктурнага пейзажа П'ера Жэрара.

Хацелася б звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць. Калі Орда толькі трапіў у Парыж, на выхадзе эпохі Асветніцтва, — лідзіруючае становішча ў культуры і мастацтве займала музыка. Нездарма там плённа працавала цэлая плеяда цудоўных еўрапейскіх кампазітараў, якія апынуліся ўсе ў адзін час у адным месцы... Але рамантыка асветніцкай эпохі заканчвалася, і наперадзе ўжо маячыла здань 1848 года. Рамантызм змяняецца на эпічнасць, з'яўляецца пачуццё грамадзянскасці ў дэмакратычным руху — у мастацтве патрэбен эпас, увогуле прэваліруюць грамадзянскія адносіны да культуры. Таму на першы план выходзіць жывапіс.

У гэтай сітуацыі, на маю думку, натуральная змена творчых арыенціраў і ў Напалеона Орды. Ён глядзіць на асяроддзе, на гістарычныя ландшафты, на помнікі архітэктуры менавіта як на эпас і лічыць, што акурат тут ён можа выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю. Пазіцыю чалавека, які разумее ўнікальнасць еўрапейскай культуры, еўрапейскай цывілізацыі — пры магчымай пагрозе непрадбачаных сацыяльных хваляванняў. Ён шмат падарожнічае, робіць малюнкі ў Іспаніі, Партугаліі, у Францыі, Германіі, Аўстрыі, Польшчы. Дарэчы, гэтыя яго замалёўкі сёння ўпрыгожваюць у еўрапейскіх краінах шыкоўныя буклеты турыстычных фірмаў. Тое, чаго ў нас пакуль няма!..



**— Але, мабыць, туга па радзіме вярнула Напалеона Орду ў родныя мясціны?**

— Калі Аляксандр II аб'явіў амністыю ўдзельнікам паўстання Тадэвуша Касцюшкі ў 1856 годзе, Напалеон Орда адразу вяртаецца на радзіму. І амаль да самай смерці (1883) з натхненнем працуе ў Беларусі, Літве, многіх рэгіёнах Украіны. Без перабольшвання можна сказаць, што Орда па сваёй прыродзе быў сапраўдным патрыётам. Будучы чалавекам сціплым высакародным, ён захаваў у сабе ідэалы культуры і сумлення, якімі захапіўся разам з сябрамі яшчэ ў Віленскім універсітэце, і калі потым змагаўся ў паўстанні Касцюшкі, ідэалы гэтыя знайшлі працяг пры знаёмстве са слыннымі творцамі еўрапейскай культуры.

**— Мастацкую творчасць Напалеона Орды называюць ілюстраванай энцыклапедыяй матэрыяльнай культуры XIX стагоддзя...**

— Творчая спадчына нашага земляка налічвае больш як 1150 малюнкаў. Большасць з іх захоўваецца ў Кракаве (іх перадалі туды родныя мастака пасля яго смерці), частка малюнкаў знаходзіцца ў Варшаве, у Львове. Некалькі арыгінальных малюнкаў захоўвае фундаментальная бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Вялікая калекцыя літаграфій з малюнкаў Н. Орды захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

**— Работы Напалеона Орды сведчаць, што ён быў нястомным падарожнікам.**

— Безумоўна. Цяжка нават уявіць, колькі ім было ўжо ў сталым узросце пройдзена і наведана ў розных кутках — ад Ковенскай губерні да Кіеўскай, ад Магілёўскай да Варшавы. Малюнак для Орды з'яўляецца не толькі творам мастацтва, але і гістарычным дакументам, у якім фіксуюцца каштоўныя архітэктурныя помнікі. Таму свае малюнкі ён суправаджае гістарычнай анатацыяй, імкнецца зафіксаваць уладальнікаў сядзіб і палацаў, прыналежнасць культавых будынкаў адпаведнай канфесіі, гады будаўніцтва, фундацыі і інш. У яго творах ярка прасочваецца жаданне данесці свае знаходкі і ўражанні ад вандраванняў да гледача.

**— Больш за 200 малюнкаў Напалеона Орды прысвечана менавіта Беларусі...**

— Каштоўнасць гэтых замалёвак перш-наперш заключаецца ў тым, што гэта не толькі мастацкія творы, але і канкрэтная гістарычная крыніца. Ім зафіксаваны ландшафт, прырода, архітэктура, людзі... Асяроддзе тых часоў!

Многія помнікі архітэктуры ці не захаваліся да сённяшняга дня, ці знаходзяцца ў дастаткова зруйнаваным стане. Малюнкі Орды маюць вялікае значэнне для аднаўлення і рэстаўрацыі.

Можна зрабіць выснову, што Напалеон Орда больш за ўсё любіў маленькія старасвецкія фальваркі і маёнтачкі, у якіх нарадзіліся многія яго сучаснікі (Касцюшка, Убель, Манюшка, Каліноўскі, Ваньковіч, Міцкевіч) і многія славутыя дзеячы беларускай культуры. Ён літаральна апаэтазаваў гэтае асяроддзе, стварыў высакародную, лірычную, шчырую карціну мясцін, якія, на жаль, у большасці сваёй можна бачыць толькі на малюнках Напалеона Орды. Лічаныя маёнткі захаваліся. Адрэстаўраваныя Завоссе і Залессе Агінскіх, Мерачоўшчына Касцюшкі, дом Ваньковічаў у Мінску... А фальваркаў, у якіх жылі патрыёты беларускай зямлі, налічвалася тысячы...

*...Невыпадкова мастацкую спадчыну Напалеона Орды называюць яшчэ і абагульненым вобразам Радзімы. У маёй роднай вёсцы Дукора калісьці быў шыкоўны палац (мясцовыя жыхары называлі яго «панскі дом»). Выява палаца захавалася толькі на малюнку Напалеона Орды: у час Вялікай Айчыннай вайны там размяшчаўся нямецкі гарнізон, партызаны знішчылі будынак... Пасля рэвалюцыі, у 1920-х гадах, у Дукорскім палацы працавала школа, якую наведвала і мая бабуля Антаніна Аляксандраўна Падаляк (1913 года нараджэння). Калі яна ўбачыла малюнак Напалеона Орды — здзівілася, што гэта не фотаздымак: «Акурат такім і быў панскі дом, і дрэвы каля яго...». І паклала малюнак сярод самых дарагіх фотаздымкаў — на памяць.*

**— Бліскуча адораны чалавек, прыгожы мужчына... А хто жонка Напалеона Орды?**

— Француженка Ірэн Батле. Ён ажаніўся ў 1943 годзе ў Парыжы.

**— Яна таксама мела дачыненне да музыкі, мастацтва?**

— Пра гэту жанчыну вельмі мала звестак. Увогуле, як ні парадаксальна, у Беларусі няма грунтоўных даследчыкаў-біёграфаў Напалеона Орды... Калі ён вярнуўся на радзіму, пра жонку абсалютна ніякай інфармацыі не было, яна не ўзгадваецца.

**— Звычайна сярод сялян з пакалення ў пакаленне перадаваліся нейкія аповеды — на ўзроўні легенд — пра жыццё гаспадароў іх мясцін...**

— Орда вельмі доўга не быў на радзіме. А прыехаў ужо сталым чалавекам. Дарэчы, пасля вяртання ён мала жыў у Варацэвічах. Шмат вандраваў. Некаторы час жыў у Гродне, у Пінску. Апошнія гады жыцця правёў у Варшаве.

Пахаваны Напалеон Орда ў г. Іванаве, у радавым склепе — згодна з яго завяшчаннем.

У 1997 годзе ў г. Іванаве яму ўстаноўлены помнік (скульптар І. Голубеў).

Спадзяюся, многія «белыя плямы» біяграфіі і творчасці нашага славутага земляка будуць ліквідаваныя ў ходзе міжнароднай навуковай канферэнцыі «Напалеон Орда: жыццё, творчасць і мастацкая спадчына». Яна пройдзе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 15—16 лютага, пад эгідай ЮНЕСКО. У складзе аргкамітэта — віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь Аляксандр Косінец, старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКО Уладзімір Шчасны, міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук, іншыя высокія кіраўнікі і вядомыя навукоўцы. У канферэнцыі будуць удзельнічаць вучоныя з Польшчы, Літвы, Украіны. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору невыпадкова з'яўляецца адным з арганізатараў гэтага мерапрыемства: спадчына, якую збіраў, замалёўваў Н. Орда, — спрадвечны прадмет даследавання нашага інстытута (помнікі гісторыі і культуры). Наш доктар мастацтвазнаўства Анатоль Кулагін некалькі гадоў таму выдаў кнігу «Беларусь у малюнках Напалеона Орды», якая карыстаецца шырокай папулярнасцю, двойчы была перавыдадзена...

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

Палац Асторпаў у вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна (1876)



## ДЗЕ ПАБУДУЮЦЬ МОГІЛЬНІК?

**5—6 лютага беларуская ўрадавая дэлегацыя пабывала на Ігналінскай АЭС. Як паведаміў начальнік упраўлення па нагляду і рэгуляванню ядзернай і радыяцыйнай бяспекі Праматамнагляда Уладзімір Сонін, у размовах з літоўскімі спецыялістамі гаворка вялася аб магчымым месцы размяшчэння могільніка радыяцыйных адходаў.**

Зараз абмяркоўваюцца дзве пляцоўкі — на адлегласці адпаведна 700 метраў і 4 кіламетраў ад беларускай мяжы. Беларускі бок, зразумела, настойвае на прыярытэце апошняга варыянту. На яго карысць схіляюцца і літоўцы. Разам з тым яны адзначаюць складаныя гідрагеалагічныя ўмовы адпаведнай пляцоўкі. Каб узвесці тут неабходны аб'ект, трэба правесці цэлы комплекс складаных работ. А гэта — павелічэнне затрат.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

**Результаты рекламной игры «НОВЫЙ ГОД — ВРЕМЯ PEPSI!»**
Свидетельство № 562 от 16.11.2006 г.

Рекламная игра «Новый год — время PEPSI!» проходила на территории Республики Беларусь с 20 ноября 2006 г. по 20 января 2007 г. Призы выдавались в зарегистрированных Центрах выдачи призов в рамках установленного рабочего времени, а также рассылались по почте с 20 декабря 2006 г. по 20 января 2007 г.

За время проведения рекламной игры призовой фонд — часы сувенирные наручные с логотипом — был роздан в количестве 404 шт.; главный приз — поездка на три персоны в г. Нью-Йорк (США) с посещением одного из клубов города в количестве 1 шт. — выиграл Онуфриев Алексей Владимирович (г. Минск).

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже имущества предприятия керамических изделий, расположенного в г.п. Радошковичи, в том числе: зданий главного производственного корпуса и заводоуправления 20733,8 кв.м, склада арочного 446,4 кв.м, проходной 36,6 кв.м и других зданий и сооружений, а так же оборудования для производства керамических изделий. Площадь земельного участка 7,2016 га. Нач. цена снижена на 20% и составляет — 1 053 230 000 бел. руб. с НДС. Объекты продаются с условием: покупатель обязан создать на базе приобретенного имущества не менее 80 рабочих мест. Оплата за объект должна быть произведена в течение 7 рабочих дней после окончания торгов. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.09.2006 г. Аукцион состоится 22.02.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.02.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322. **Контактные телефоны: (8017) 224-61-34, (801773) 70070. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (7 лютага).** Па гарызанталі: Гравітацыя. Ангел. Юта. Скат. Ментол. Ара. Гіра. Смага. Зіма. Рупар. Небарака. Даха. Апука. Мор. Тур. Атаксія. Явар. Граб. Цыкада. Інтрыга. Адам. Унук. Баку. Пірат. Аніс. Ілька. Накат. Зона. Сплаў. Нектар. **Па вертыкалі:** Ківі. Амарант. Махота. Туга. Арабіка. Бас. Рыс. «Сотбі». Рагнеда. Расін. Язык. Лаза. Валюта. Кнот. Гуськоў. Торс. Кан. Салам. Барэц. Платан. Арап. Гуру. Якар. Гапак. Вада. «Ака». Адат. Каністра. Храм. Шулер.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# ШАЛЯЎ чакаюць новыя прыемныя знаёмствы, а СТРАЛЬЦОЎ — рэалізацыя творчых планаў



**АВЕН.** Пераадолець перашкоды, якія ўзнікаюць, дазволяць душэўны спакой і ўпэўненасць у правільна выбраным накірунку і асабістых сілах. У аўторак не варта даваць усім без разбору: патрабуйце дакументальнага пацвярджэння кантактаў. У чацвер пастарайцеся правесці вечар з каханым чалавекам, інакш у вас можа з'явіцца нагода для рэўнасці. Пятніца — дзень абяцання. Вас чакаюць сустрэчы з людзьмі з даўняга мінулага і новыя знаёмствы. У выхадныя дні не варта дзяліцца сваімі тайнамі нават з самымі блізкімі людзьмі.

**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень абяцае быць напоўненым эмацыянальнымі пераменамі і падзеямі. Імкнучыся да поспеху, запасіцеся трываласцю, упартасцю, інтуіцыяй. Зносіны і вялікая колькасць сустрэч дазволяць падтрымліваць сябе ў тонусе. І не забывайцеся ўзбагачаць сваю галаву новай інфармацыяй, бо веды — сіла. Справы на працы абяцаюць скласціся даволі паспяхова, а дасягненні могуць здзівіць нават вас. У панядзелак пажадана пазбягаць мітусні і скараспелых неабдуманых рашэнняў. У аўторак добра займацца афармленнем афіцыйных папер і наведваннем афіцыйных устаноў. Але неабходна ўлічваць, што паспяховасць такіх мерапрыемстваў залежыць ад вашай эмацыянальнай раўнавагі. У сераду, пры неабходнасці, можна звярнуцца па дапамогу да партнёраў па бізнэсу — яны дапамогуць, калі змогуць. Чацвер — удалы дзень для паездак. У пятніцу пастарайцеся не стаць ініцыятарам канфліктных сітуацый — паспрабуйце лепш прысвяціць гэты дзень адпачынку на свежым паветры. Нядзеля — спрыяльны дзень для вырашэння сямейных праблем.

**БЛІЗНЯТЫ.** Сабярыцеся з сіламі і зрабіце на гэтым тыдні як мага больш работы, нават калі на вашым шляху будуць пастаянна ўзнікаць непрадбачаныя абставіны. У якасці ўзнагароды перад вамі могуць адкрыцца новыя перспектывы. Асноўныя праблемы павінны адысці ў мінулае. Тайныя нядобразычліўцы, калі яны маюцца, хутчэй за ўсё, праявяць сябе, зрабіўшы памылку. Першая палова тыдня будзе больш насычанай, чым другая: выкарыстоўвайце спрыяльнае размяшчэнне зорак і максімальна рэалізуйце свае магчымасці. У пятніцу старайцеся не ленавацца, хоць гэта і будзе няпроста. Прысвяціце адзін з выхадных сябрам, а другі — сабе. Не дазваляйце каб калегі ці, напрыклад, начальнікі спакушаліся на ваш асабісты час.

**РАК.** З'явяцца новыя дзелавыя партнёры і заступнікі — у сувязі з гэтым вы можаце рэалізаваць самыя дзёрзкія планы, стварыць добры задзел на будучыню, палепшыць матэрыяльнае становішча. Удача будзе спадарожнічаць у самых розных справах. Першая палова тыдня будзе поўная цікавых і нават загадкавых сустрэч і запомніцца надоўга. У аўторак, магчыма, вы нарэшце справіцеся са складанымі задачамі — і гэта выкліча мноства перамен у прафесійным плане. Цалкам рэальныя праблемы з пажылымі бацькамі, а таксама візіт кагосьці з родных.

**ЛЕЎ.** Вы не проста абавязаны — вы будзеце вымушаны даводзіць да завяршэння практычна ўсе пачатыя справы менавіта на гэтым тыдні. У аўторак прыток сіл дазволіць у літаральным сэнсе звярнуць горы. Могуць ажыццявіцца нават самыя нязбытныя мары. Галоўнае — не сумнявайцеся, бо ўсё залежыць ад вас. У выхадныя дні няблага пройдзе арганізацыя невялікага свята.

**ДЗЕВА.** Тыдзень прыдатны для заняткаў, прысвечаных павышэнню прафесійнага ўзроўню. Вам будзе спадарожнічаць удача і раскрыццё творчага патэнцыялу ў галіне навучання і самаадукацыі. Тыдзень будзе цікавы і насычаны падзеямі. Аднак у гэты перыяд вам будзе ўласціва асаблівая прамалінейнасць. Абвострыцца пачуццё гумару. Калі вы не будзеце праяўляць залішняй прынцыповасці, то ва ўсіх бітвах з апанентамі атрымаеце перамогу. Невялікі адпачынак, нядоўгая паездка ці падарожжа дазволяць развеяцца і ўбачыць сітуацыю, якая склалася, збоку.

**ШАЛІ.** Панядзелак — дзень спаборніцтваў. Гэты занятак можа паглынуць усе вашы думкі. Пастарайцеся своечасова спыніцца — толькі тады ў вас з'явіцца шанцы на поспех. У аўторак могуць чакаць новыя прыемныя знаёмствы, якія з цягам часу перарастуць у сапраўднае сяброўства. У сераду можаце рэалізаваць свае задумы, але для гэтага спатрэбіцца шмат цярпення і вытрымкі. У суботу непажадана лгаць, бо падман можа хутка раскрыцца.

**СКАРПІЁН.** Настае тыдзень даволі ўдалы ў эмацыянальным плане. Найбольш верагодны яе мінус — магчымая паломка якой-небудзь тэхнікі, хутчэй за ўсё бытавой. Але нават гэта не выведзе вас з раўнавагі. У панядзелак асцерагайцеся чужых парад: не выключана, што іх будуць даваць скрытыя нядобразычліўцы. У аўторак вы будзеце як ніколі лёгкія на пад'ём, але лепш большую частку часу прысвяціць завяршэнню неадкладных спраў. У пятніцу падумайце, што б вы хацелі змяніць, — у бліжэйшай будучыні ў вас з'явіцца такая магчымасць. Вы будзеце прыемным суразмоўцам, так што не цурайцеся кампаніі.

**СТРАЛЕЦ.** Неабходна засяродзіцца на самай важнай справе ў дадзены момант часу. Давядзецца адстойваць свае інтарэсы ў адносінах з партнёрамі. Рэальна разлічвайце свае сілы, пастарайцеся на працы вырашаць толькі тыя праблемы, якія залежаць ад вас. У панядзелак пастарайцеся пазбягаць канфліктаў і авантур, якія могуць прынесці страты. Пятніца — цудоўны дзень для рэалізацыі творчых планаў. Але не варта пакуль дзяліцца сваімі задумамі з начальствам: яно можа не зразумець вас і задушыць адзін з самых цудоўных парываў.

**КАЗЯРОГ.** Каб не расчаравацца ў выніках сваёй дзейнасці, не спрабуйце плыць супраць цячэння. Хочацца вызначыцца — будзьце па-свойму арыгінальныя, але засцерагайцеся эпатажу. Тыдзень вельмі спрыяльны для творчых заняткаў, якія патрабуюць адасаблення. Рэклама сваёй персоны не рэкамендуецца. Перш чым пачынаць штосьці новае, упэўніцеся, што нейкая справа, якую вы лічыце завершанай, сапраўды дavailaведзена да розуму. Не пакідайце недапрацовак. Зараз вы на грэбні хвалі — не забывайцеся дапамагаць іншым. У чацвер знайдзіце час застацца са сваімі думкамі сам-насам.

**ВАДАЛЕЙ.** Не імкніцеся любой цаной дасягнуць жаданай мэты. Чым менш намаганняў вы будзеце прыкладаць да якой-небудзь справы, тым прасцей яна будзе вырашацца. Магчымы не вельмі прыемныя перамены на працы і неразуменне з боку начальства. Верагодны пэўныя затрымкі з выплатай грошай. У панядзелак пастарайцеся не выплюхваць раздражненне, якое ўзрасло, на акружаючых. Серада можа аказацца днём паездак і сустрэч з сябрамі і знаёмымі. У чацвер верагодны пэўныя непаразуменні з партнёрамі па бізнэсу. У пятніцу рэкамендуецца завяршыць пачатыя раней справы. У выхадныя змена месцаў і ўражанняў — галоўныя ўмовы поспеху.

**РЫБЫ.** Праца не запатрабуе ад вас залішняга напружання. На ваш кар'ерны рост можа станоўча паўплываць чалавек, які даўно з вамі працуе, — вы дарэмна пазбягаеце больш цеснага супрацоўніцтва з ім. Панядзелак — спрыяльны дзень для пачатку падарожжаў: калі адправіцеся ў паездку, то чакайце выгадных знаёмстваў з замежнымі калегамі і камерцыйных прапаноў, якія лепш прыняць. Не выключана, што ў аўторак знойдуцца калісьці ўкрадзеныя ці згубленыя рэчы. У нядзелю вам давядзецца паспяшацца на дапамогу камусьці з родных.

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.41 | 17.08 | 9.27 |
| Віцебск — | 7.34 | 16.54 | 9.20 |
| Магілёў — | 7.31 | 16.58 | 9.27 |
| Гомель — | 7.23 | 16.59 | 9.36 |
| Гродна — | 7.55 | 17.24 | 9.29 |
| Брэст — | 7.51 | 17.29 | 9.38 |

### Месяц

*Апошняя квадра 10 лютага*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

**Пр.** *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Селівана, Якава;* **К.** *Бажэны, Бернардэты, Брыгіты, Марыі, Альгерда, Рыгора.*







## 10 лютага

Дзве даты

**1132 год** — 930 гадоў таму з Полацка быў выгнаны кіеўскі намеснік. На полацкі пасад узышоў князь Васілька Усяславіч, брат Ефрасінні Полацкай. З ім звязана ўсталяванне ў Полацку прынцыпу абранасці князя вечам.



**1909 год** — у Брандэнбургу (Германія) ваенны аркестр 17 разоў выканаў гімн «Божа, барані караля» ў чаканні англійскага манарха Эдуарда, які ніяк не мог апрануць форму нямецкага фельдмаршала.

Цытата дня:

***«Хоць праца і асалода вельмі розныя па сваёй прыродзе, усё ж паміж імі існуе нейкая натуральная сувязь».***

**Ціт Лівій (59 да н.э. — 17 н.э.), рымскі гісторык.**

Утерянный страховой полис по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Гомеле серии АД № 4994622 ***считать недействительным.***

Анталогія беларускай песні

# Тонкая сасёнка

Наталля Раманская, салістка ансамбля «Бяседа», мае прыгожы голас — лірычнае сапрана. У спеве яна вельмі тонка перадае духоўны змест песні, стварае запамінальныя мастацкія вобразы і малюнкі. Спявачка стала першай выканаўцай (сола і ў дуэце) шэрагу вакальных твораў Леаніда Захлеўнага, Уладзіміра Карызны-малодшага. З вялікім майстэрствам яна выконвае песні «Дарога ля жыта», «Каліна ў полі», «Ночка-ночанька», «Зорачка мая», «Падаюць зоры», «На азёрах сініх» і іншыя. Сярод іх — і беларуская народная песня «Тонкая сасёнка», у якой разгорнутае параўнанне з сімвалічным дрэвам дапамагае артыстцы асвятліць будучы шлях маладой дзяўчыны.

**Міхась ШАВЫРКІН.**




**Беларуская народная песня**

*Тонкая сасёнка ў лесе зашумела,*
*Малада дзяўчыначка замуж захацела.*

*Ці ты, дзяўчыненька, век хлеба не ела,*
*Што ты, маладзенька, замуж захацела?*

*Лепей стань, падумай, каб не ашукацца.*
*Будзе табе горай, як у роднай маці.*

*Сядзеш над калыскай, будзеш калыхаці:*
*«Люлі, люлі, мой сыночак», песенькі спяваці.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

## Асцярожна: галалёдзіца!

**Засцерагчыся ад небяспекі пры падзенні на слізкай дарозе цяжка, але магчыма. Для гэтага спатрэбіцца вокамгненная рэакцыя і пэўны спрыт.**

У момант падзення важна згрупавацца так, каб атрымаць як мага меншы ўдар. Падаць трэба не плазам на бок, наперад ці назад, а як быццам паступова: перанесці цяжар спачатку на галёнку, потым на бядро, пераходзіць на перадплечча ці плячо, з кожным разам змякчаючы ўдар. Гэта зрабіць складана і не заўсёды ўдаецца нават трэніраваным людзям. Тым не менш, іншы раз перад тым як упасці, некаторыя балансуюць, слізгацяць, выраблююць рукамі і нагамі розныя кульбіты. А ў гэты момант трэба думаць не аб тым, як весела назіраць за вамі тым, хто ідзе побач, а аб уласных касцях. Асноўнае правіла — не падаць на адну пэўную кропку, а як быццам размеркаваць сілу ўдару на розныя часткі цела.

Што датычыцца аўтамабілістаў, то ім у першую чаргу неабходна паклапаціцца пра зімовую гуму, добрыя тармазы і, самае галоўнае, — уважлівасць. Прафесіянал убачыць па колеру асфальту, дзе можна «паслізнуцца». Калі вы да іх сябе не адносіце (аб'ектыўна), то ездзіць лепш павольна. Знайдзіце час, каб патрэніравацца кіраваць машынай на галалёдзе ў якім-небудзь адасобленым месцы, навучыцеся правільна тармазіць на лёдзе і не губляць самавалодання ў экстраннай сітуацыі.

**НЕАБХОДНЫЯ ДРОБЯЗІ**

- Абутак павінен быць не слізкім, зручным, з добрай падэшвай. Калі ісці і турбавацца аб тым, як бы не адламаўся дзесяцісантыметровы абцас — шпілька, то думаць пра рукі-ногі ўжо не атрымаецца.
- Не спяшайцеся. Лепш выйсці з дому крыху раней, чым потым несціся, нібы тарпеда, збіваючы слупы і людзей.
- Чакаючы аўтобус, трымайцеся падалей ад краю. Калі аўтобус будзе пад'язджаць да прыпынку, вы можаце выпадкова паслізнуцца і трапіць пад колы.
- Будзьце ўважлівымі нават на тратуары — машыну можа занесці або ў адказны момант вадзіцель не зможа затармазіць. Улічыце, што калі перабягаеце дарогу перад аўтамабілем, які рухаецца, то тармазны шлях на слізкай дарозе павялічваецца ў 4—5 разоў. Памятайце, машыну нельга спыніць імгненна.
- Пешаход, вядома, заўсёды мае рацыю, аднак менавіта з-за яго часцей адбываюцца ДТЗ. Прычына вядомая — перайшоў дарогу ў непрызначаным месцы. Адсюль — мноства праблем. Таму лепей дайсці да месца пераходу і патраціць лішнюю хвіліну, чым потым збіраць канечнасці па кавалачках.

НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

## Якая Масленка без бліноў!

**Наперадзе нас чакае масленічны тыдзень. А гэта значыць, шаноўныя гаспадыні, што можна «законна» ўвесь гэты час ласавацца блінамі і частаваць імі сваіх блізкіх і гасцей.**



**БЛІНЫ НЯДЗЕЛЬНЫЯ**

*4 шк. мукі, 25 г дражджэй, 2 яйкі, 1,5 шк. малака, 2 ст. лыжкі алею, 0,5 ч. лыжкі цукру, соль.*

З усёй мукі, 3 шклянак падагрэтай вады і дражджэй замясіце ўвечары цеста і пакіньце яго да раніцы. Закіпяціце малако і, памешваючы, уліце яго ў цеста, дадайце яйкі, соль, цукар, алей, старанна перамяшайце. Пастаўце ў цёплае месца на 25—30 хвілін, каб цеста паднялося. Смажце бліны на добра разагрэтай патэльні, не падмазваючы яе (цеста з алеем).

Бліны добрыя і самі па сабе, і са смятанай, і з ікрой. «Чырвоную ікру» гатуем так: дробна нарэзаную вараную моркву змяшайце з сечаным селядцом, дадайце крыху масла — і на стол.

-2386-

ПАМІЖ НАМІ, ЖАНЧЫНАМІ

## Дзве гадзіны на курорце, не выходзячы з дому

**Скажыце шчыра, што вы будзеце рабіць, калі вашы хатнія кудысьці знікнуць на некалькі гадзін і вы застаняцеся дома адна? Хутчэй за ўсё пачняце загінаць пальцы: прыгатую абед, прыбяру ў доме, памыю бялізну, схаджу ў магазін па прадукты... Стоп!**

**Прапануем вам іншы «сцэнарый». Уявіце сабе, што вам гэты час падарылі. Чаму б не пабываць на... курорце? Тым больш, што паездка «на воды» пакуль не плануецца, і водпуск яшчэ не хутка. А ехаць нікуды і не трэба — курорт вы арганізуеце ў сваёй кватэры.**

Запаліце духмяную свечку, уключыце ціхую прыемную музыку, прыгатуйце якую-небудзь ванну: травяную, салявую, хвойную... І — атрымлівайце асалоду. Але спачатку некалькі добрых парад.



**ПРЫЕМНАЕ З КАРЫСНЫМ**

Вялікае значэнне мае працягласць працэдуры і тэмпература вады. Сядзець у ванне гадзінамі шкодна для сэрца і для скуры, якая ад гэтага перасушваецца. Не трэба прымаць ванну штодня, дастаткова — 1—2 разы на тыдзень. Лежачы ў вадзе, не ешце, не чытайце, а тым больш не курыце і не ўжывайце спіртныя напіткі. Усё гэта павялічвае нагрузку на арганізм і перашкаджае расслабіцца. Аптымальная тэмпература вады 36—38°. Працягласць ванны — 15—20 хвілін. Сачыце за тым, каб шыя і грудная клетка заставаліся над паверхняй вады.

Самая папулярная ванна — **салявая**. Для яе прыгатавання выкарыстоўваюць марскую ці звычайную соль (300—500 г). Яна выводзіць таксіны з арганізма, садзейнічае пахудзенню, знімае стомленасць, паляпшае абмен рэчываў.

**Хваёвая** ванна дапаможа пры расстройствах нервовай сістэмы. Можна загадзя купіць у аптэцы гатовы вадкі экстракт ці хваёвы парашок (а можа, у вас засталіся шыпулькі ад навагодняй ёлкі?). Экстракт растварыце ў вядры вады, а затым выліце ў ванну, старанна перамяшайце. Шклянку здробненай іглiцы загадзя заліце 1,5 л кіпеню, настойце, дадайце ў ванну.

Выдатна заспакойвае **травяная** ванна. Змяшайце, напрыклад, лаванду, чабор, мелісу, мяту, шалфей (па 100 г кожнай). Заліце трыма літрамі кіпеню, настойце 15 хвілін, затым працадзіце і выліце ў ванну.

Праз 20 хвілін з ванны можна выходзіць. Накіньце махровы пушысты халат, галаву абкруціце ручніком і хуценька ў спальню. Завесьце шторы, каб у пакоі была паўцемра. На твар пакладзіце якую-небудзь пажыўную маску і спакойна паляжыце. Час нібы спыніўся. За акном шуміць не вецер, а, напэўна, мора. Праз 20—30 хвілін змыйце маску і ідзіце на кухню, дзе прыгатуйце сабе свежы сок ці травяную гарбату. Піце не спяшаючыся, маленькімі глыткамі і ні аб чым не думайце. Вы адчуеце, як уліваюцца ў ваш арганізм новыя сілы. Вось і ўсё. Адвесьце шторы, прыбярыце «сляды адпачынку». Цяпер з усмешкай можна сустракаць сваіх блізкіх. Па магчымасці абавязкова скарыстайце наш «сцэнарый». Не пашкадуеце!

-2387-




## Урок «японскай»...

Ці не ў кожнага настаўніка такіх гісторый — мільён, шкада толькі, што расказваюць не ўсе...

Уяўляйце: вясковая школка. Першы клас. І досыць вялікі. Усіх дзяцей настаўніца пакуль не запомніла, а тым больш — не паспела заўважыць яшчэ, што адзін з вучняў замест звонкіх зычных вымаўляе глухія. Раздала сшыткі. Дзеці схіліліся, стараюцца, пішуць. А гэты — сядзіць.

— Што здарылася? Чаму ты не пішаш? — ціхенька пытае настаўніца.

— А тахалі нахамі, — гаворыць Пеця.

— Што-што?

— Тахалі нахамі...

Не разумее настаўніца. Пытае ў суседа па парце:

— Што ён гаворыць?

— Ён гаворыць, што вы палажылі яму сшытак дагары нагамі...

Перавярнуць — ён, бедны, не здагадаўся.

**Аліна Эдуардаўна Якубовіч,**
*в. Струбніца, Мастоўскі раён*

## Не ўсё тое золата...

Гэта гісторыя адбылася з нашымі турыстамі. Тады яны не так часта бывалі за мяжой, да ўсяго прыглядаліся, шмат якія дзіковінкі везлі дадому. Вось драбяза, здавалася б, раздаюць у аўтобусе нейкія маленькія лёгенькія пакецікі. Не напісана на іх нічога, намаляваны — парэзаны лімон...

Шмат хто з турыстаў падумаў, што гэта — заварка для чаю. Таму за яе — і ў кішэню...

І от адзін з падарожнікаў прыязджае дадому, ставіць чайнік на пліту, налівае кіпеню ў кубак, кідае пакецік. Хвіліна прайшла, другая — няма ні колеру, ні смаку. І пахне таксама ледзь-ледзь... Невядома чым.

Цікава стала, што ж гэта за заварка такая? Узяў другі такі ж пакецік, асцярожна разарваў, а там... сурвэтачка — вусны выціраць.

Пасля таго, відаць, як нашай гарбаткі пап'еш.

**Сяржук Чылікін-Садэльскі,**
*г. Мінск*

## Гад? Побач

Нехта з класікаў пісаў «Времена не выбирают, в них живут и умирают». У горадзе — акурат таксама — не выбіраюць суседзяў. Мне на сваіх яшчэ і грэх скардзіцца — ні алкаголікаў за сценкай, ні зладзеяў, ні меламанаў... Зверху толькі вечны будаўнік: у сэнсе — колькі жывём, столькі ён кватэру рамантуе — стукае, грукае, пілуе, прыбівае...

Мы ўнучачку неяк да сябе забралі, толькі спаць палажылі, зверху ду-дух, ду-дух. Пабудзіў...

— Во гад! — кажу.

І малая (следам за мной) пальчыкам на столь паказвае: там гад. Наверсе.

...У тую ноч унучкі ў нас не было, мужа дома — таксама (ён у начную працаваў), таму я рашыла адаспацца, крыху раней лягла... Не ведаю, колькі праспала, чую — шум нейкі: быццам дождж ідзе, але не за вокнамі, а ўнутры, у кватэры. Устала, уключыла святло, адчыніла дзверы ў ванну, у туалет і душа ў пяткі: вада па сценах бяжыць, ніжніх суседзяў зараз зальём. Да таго ж і самі плітку нядаўна паклалі. Усё, думаю, адстане, адваліцца. Выскакваю, як Піліп з канапель, і наверх — да суседа. У дзверы званю, крычу:

— Уставайце! Вы людзей залiваеце!

А ён мне з-за дзвярэй (галоўнае спакойна так):

— Быць таго не можа! У нас — усё ў парадку.

— У якім, — крычу, — парадку? У нас вада па сценах бяжыць. Самі паглядзіце, калі не верыце... Ды хутчэй жа!

— Зараз, — цягне, — апрануся... Не ў трусах жа мне ісці?

— А мне, — кажу, — па барабану ў чым! Хоць і без... Толькі хутчэй!

Сама кумільгом уніз... Па лесвіцы. Чую — ён ззаду шлёпае. І насамрэч у трусах (прыгожыя такія, у кветачку... Як потым разгледзела). Зайшоў у ванну да нас, убачыў, што я яго не падманваю, падаўся да сябе, каб разабрацца, што там зрабілася. Толькі нашы дзверы за сабой зачыніў, — муж мой насустрач — з работы трохі раней сарваўся...

Не ведаю, як там яны глядзелі адзін на аднаго, што казалі і думалі, але шчасце, што абодва цвярозыя і ў гарачай вадзе не купаныя — размінуліся. Мой дадому прыйшоў, убачыў, што тут робіцца. І ўслед за ўнучкай пальцам паказаў наверх, паўтарыў яе:

— Там гад.

Там...

**Л.Н.**
*г. Мінск*

## Якія былі дзядзькі!

Мусіць, заўсёды, гледзячы на сучасныя часы і норавы, прызнавалі ўсе, што вось уперад... І неба было вышэйшае, і трава зелянейшая, і людзі дабрэйшыя, а ўжо дзеці...

Вось і я пра тое ж. Ніякіх садкоў у вёсцы, ніякіх псіхолагаў. Бацькі працуюць ад цямна да цямна. І не дай Бог ім пачуць ад дзіцяці «чорт з ім». Так «чортнуць», — болей не захочаш. Прычым не пугай, не махрачом якім. Слова строгага было дастаткова. У галовы не прыходзіла шкоду якую рабіць ці нешта ўкрасці... Ды і часу на дурное не мелі — занятыя былі.

Прынамсі, мы з Лёнчыкам на рыбу хадзілі. Лёнчык — гэта брат мой — старэйшы на чатыры гады. Не хацеў ён мяне браць, ды нідзе не дзенешся... Да таго ж я са скуры лезла — старалася яму дагадзіць — вуды насіла, чарвякоў падавала. Толькі раз правінілася.

У той дзень маці падняла нас надосвітку, звязала ў хусцінку нешта на сняданак, адправіла. Да Прылаконня (ёсць такое месца на Дняпры) кіламетры са тры трэба ісці — па расе, босымі (зараз на такую «працэдуру», мусіць, палкай бы не выгнаў. — **Аўт.**). А па дарозе там Быстрэц яшчэ — шчупакі ў ім добра лавіліся... Нельга ж прамінуць? Закінуў брат вуду раз, потым другі... На чацвёрты — рыбіну выцягнуў. Ад радасці аж дух заняло: даўжыня сантыметраў 70. Мы такой ні разу дамоў не прыносілі...

Але пра тое, як прынясём, думаць рана яшчэ — мы ж на рыбу ідзём.

Дайшлі да месца, брат вуды паставіў, адышоўся крыху. А шчупак наш (Лёнчык для яго спецыяльны крук зрабіў — з лазіны) у траве ляжыць і, бедны, паветра ротам хапае, хапае, ды так... Шкада мяне яго стала. Дай, думаю, паднясу бліжэй да вады. Яму ж палягчэе? Узяла аберуч, падцягнула, а ён плясь хвастом і ў раку. Разам з той лазінай...

Я ледзьве ўслед не нырнула! Цудам стрымалася... Па беразе бегаю, скуголю. Заб'е ж Лёнчык, а найгоршае — ніколі з сабой больш не возьме...

Толькі ўявіла я гэта, бачу з-пад кручы... шчупак вылятае. Прасвістаў над галавою ў мяне і плясь каля ног. Я аж знямела ад нечаканасці. І цяпер толькі згледзела двух дзядзькоў, што якраз у гэты час і ў гэтым месцы рыбу з лодкі лавілі. Яны, відаць, бачылі ўсё і, пашкадаваўшы малое, злавілі таго шчупака (з лазіной ён не мог пайсці ў глыбіню), выкінулі на бераг. А, магчыма, і свайго падарылі (гэты — мне і большым падаўся, і прыгажэйшым)...

Вельмі хацелася тут жа пабегчы да Лёнчыка, усё расказаць, але страшна было.

Асмялела — па дарозе дамоў...

Атрымала, зразумела ж, добрага кухталя і загад нікому ніколі пра гэта не расказваць, бо брату ж, канешне, хацелася, каб шчупак быў «чысты», яго. І толькі.

...Пасля той рыбалкі былі ў нас з Лёнем і іншыя, — а вось такіх шчупакоў не было. І дзядзькоў (хаця б нечым падобных!) больш у жыцці не сустрэлася: сённяшнія (я чамусьці ўпэўнена), не кінулі б нават уклейку.

**Софья Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён*

## Дзесятая вада на кісялі

Гады ідуць. І пакідаюць успаміны.

Не ведаю, як цяпер, а некалі былі ў школах так званыя прадметныя секцыі: настаўнікі хадзілі да калег на ўрокі, потым абмяркоўвалі іх, чыталі свае даклады па тэме. Атрымліваўся вельмі цікавы і вельмі карысны абмен — ведамі, вопытам, сакрэтамі. Дык вось...

Чарговае пасяджэнне секцыі было запланавана ў суседняй школе. У нашай — тады быў свой конь. Запрэглі мы яго, уселіся ў сані і паехалі ў вёску Забалацце. Зрабілі ўсё, што планавалі, выканалі, так бы мовіць, абавязковую праграму, — настаўніца, якая давала ўрок, запрашае да сябе дадому, на абед. Зразумела ж, наварыла ўсяго, напякла, у чаркі наліла... Цудоўна, душэўна пасядзелі! Але ж трэба і меру ведаць. Дзякуем, развітваемся. Ужо тупаем ля саняў, ля каня... Выбягае з хаты гаспадыня. Крычыць:

— Людцы мае, а кісель?! Гэта ж трэба — наварыла кісялю, ды й багата, а на стол паставіць — забылася.

Мы ў рогат...

Вяртацца, зразумела ж, не сталі.

А цяпер шкада: кісель тады падавалі не ў шклянках — у місках альбо талерках. Ды сапраўдны, густы. Яго лыжкамі елі... Смаката...

Яе, у той раз не адведаный, мо, шкадуюць недзе і былыя каляжанкі мае — Марыя Карнілаўна, Усціння Аляксееўна, Соф'я Фёдараўна, Вера Варфаламееўна?

Добра было б спаткацца. Хоць успамінамі.

**Валянціна Гудачкова,**
*г. Жыткавічы*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 817. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12